2. Гудков, Д.Б. Ритуалы и прецеденты в политическом дискурсе // Политический дискурс в России / Д.Б. Гудков; под ред. Ю.А. Сорокина, В.Н. Базылева. – М., 1998.
3. Плотникова Л.И. Новое слово: Порождение, функционирование, узуализация / Л.И. Плотникова. – Белгород, 2000.
4. Сцяцко, П. Культура мовы / П. Сцяцко. – Мінск, 2002.
5. Сарнов, Б.М. Наш советский новояз. Маленькая энциклопедия реального социализма / Б.М. Сарнов. – М., 2002.

БЕЛАРУСЫ Ў "ПАДАРОЖЖЫ ПА ПАЛЕССІ І БЕЛАРУСКІМ КРАІ" П. ШПІЛЕЎСКАГА

В.Ю. Бароўка
Віцебск, ВДУ

Рускамоўны цыкл нарысаў "Падарожжа па Палессі і Беларускім краі" (1853–1855) Паўла Шпілеўскага стаў у XIX стагоддзі свайго роду белетрызавана-дакументальным адкрыццём Беларусі для шырокага кола аматараў краязнаўства і слоўнага мастацтва ў Расіі і за яе межамі. Мэта дадзенай працы – на аснове выкарыстання прыёмаў культурна-гістарычнага, фенаменалагічнага і дэскрыптыўнага метадаў выявіць эстэтычную адметнасць народазнаўчага плана ў "Падарожжы...", спецыфіку абмалёўкі Шпілеўскім вобраза беларуса.

Мастацкая літаратура – істотная крыніца народазнаўства, этнаграфічны эпіфеномен. Асэнсаванне і рэпрэзентацыя народа ў слоўным мастацтве хоць і полігенетычныя па сваёй прыродзе, аднак тлумачацца галоўным чынам асаблівасцямі эстэтычнага асваення свету ў прыгожым пісьменстве. Матэрыял, які акумулюе ў сабе інфармацыю пра быт, лад жыцця, гісторыю народа, шматвяковы вопыт і погляд на свет, выяўляе субстрат нацыянальнай культуры, канцэптуальна апрацоўваецца пісьменнікамі ў адпаведнасці з законамі мастацкай творчасці, непадзельнай з выкарыстаннем абагульнення і ўмоўнасці, а потым увасабляецца ў вобразнай слоўнай форме, дзе спалучаюцца аб'ектыўнае і суб'ектыўнае, канкрэтнае і абагульненае, лагічнае і інтуітыўнае, таму вынікі эстэтычнага спасціжэння народа адпачаткова дыялагічныя і кантэкстуальныя. Для аповеду пра Беларусь і беларусаў Шпілеўскі абраў форму падарожнага нарыса. Па сюжэце твора апавядальнік адпраўляецца з Варшавы ў вандроўку па Беларусі. На самым пачатку аўтар паведамляе, што паездка з Захаду на Усход для яго – жаданае наведванне родных мясцін. Жанр падарожнага нарыса даваў пісьменніку магчымасць панарамна паказаць рэчаіснасць, адвольна абыходзіцца з фактычным матэрыялам, адкрыта выказаць свае меркаванні пра характар, мінулае і сучаснае землякоў, спалучыць у адно мастацкае цэлае разважанні, дакументальныя звесткі, уласныя фальклорна-этнаграфічныя запісы.

Беларусь у часы Шпілеўскага афіцыйна асацыявалася з Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерніямі. П. Шпілеўскі называе беларусаў "беларусцамі", але такі тэрмін не ўтрымлівае ў сабе абразлівых канатацый. Пісьменнік акцэнтаваў сваё захапленне мовай і культурай беларусаў. Ён падкрэсліў, што беларуская мова – старажытнаруская мова, на якой размаўлялі "галоўныя славянарускія плямёны" крывічы і дрыгавічы, на якой у даўнія часы на Русі пісалі многія дзяржаўныя акты, дагаворы, выдалі Літоўскі Статут. Навукоўцам Шпілеўскі раіў: "...Беларуская мова такая самастойная, такая характарыстычная ў археалагічных і філалагічных адносінах, паданні, павер'і і казкі такія арыгінальныя, насычаныя

Репозиторий ВГУ

першабытнай, старажытнай паэзіяй славяна-рускай, што пры цяперашнім напрамку і развіцці ў нас філалогіі і археалогіі становіцца неабходным даследаваць і адшукаць галоўны прытулак старажытнай рускай славяншчыны і пазнаёміцца з родапачынальнымі яе элементамі, якія захаваліся ў Беларусі" [1, с. 52]. Паводле Шпілеўскага, вывучэнне беларускай мовы і беларускага фальклору жыццёва неабходна для разумення мінулага, сучаснасці і гістарычных перспектыў краю. Дэталёва паказваліся апавядальнікам знешні выгляд, звычаі, побытавае атачэнне, ментальнасць беларусаў. Вельмі актыўна Шпілеўскі ўводзіў у рускамоўны тэкст беларусізмы для перадачы нацыянальнага каларыту і светабачання (гасцінец, комін, атава, світка, азярод, хлопцы і інш.). Падчас знаходжання ў Сяняўцы, для прыкладу, падарожнік звярнуў увагу на беларускія танцы "мяцеліца" і "пацяруха", зусім не падобныя да танцаў рускага прастанароддзя. А ў раздзеле "Барысаў" падрабязна расказаў пра звычай запрашэння "кумоў спатыканых", каб уратаваць жыццё наванароджанаму дзіцяці тых бацькоў, у якіх дзеці "не вядуцца", гэта значыць паміраюць.

Тэкст "Падарожжа..." надзвычай багаты апісаннямі розных бытавых здарэнняў, узнаўленне якіх суправаджалася кароткімі аўтарскімі сентэнцыямі, дзе артыкуляваліся гістарычна сфарміраваная талерантнасць беларусаў, якія фактычна пастаянна пражывалі ў атачэнні рускіх, палякаў, яўрэяў, цыган, іх бескарыслівасць, добразычлівасць, спагадлівасць, дабрыня, працавітасць. П. Шпілеўскі звяртаў увагу на дасціпнасць беларусаў, іх уменне трапна расказаць свету пра сябе ў прыказках і прымаўках. Так, у раздзеле пра наведванне Нясвіжа пісьменнік нагадаў народныя выслоўі: "У Нясвіжы люд хіжы: салому таўкуць ды бліны пякуць; сена смажуць, бліны мажуць". Селянін-беларус, у трактоўцы Шпілеўскага, не гоніцца за вялікім багаццем: "Хата беларускага мужыка сціплая, але ён задаволены ёю і сваім лёсам..." [1, с. 113]. На першы погляд, Шпілеўскі тэндэнцыйна аптымістычна ацэньваў тагачасны стан прыгоннага сялянства: "Быт народа мінскага ў цяперашні час даволі бязбедны і нават у квітнеючым стане... мінскія пасяляне ўсё ж жывуць без гора і задаволеныя сваім цяперашнім лёсам: галоўная вартасць пасялян мінскіх тое, што яны, падобна да сваіх продкаў крывічоў, шчыра аддадзеныя свайму ўраду і рэлігіі" [1, с. 110]. Праўда, з выказваннем пра квітнеючы стан не вельмі стасаваліся заўвагі наконт векавечнай аднастайнасці быту: "Дажынкі, хрысціны, імяніны і вяселлі складаюць для іх усе радасці, усю весялосць: яны задавальняюцца чаркай водкі, кавалкам свінога сала ці вяндліны, яечняй і мядовымі каржамі (засушаныя бліны); свежыя ягады і грыбы летам, сушаныя ягады, каляныя арэхі і гарбузовыя зярняты зімой складаюць іх ласунак і дэсерт" [1, с. 111].

Шпілеўскі-нарысіст адзначыў, што беларускія землі развіваюцца нераўнамерна. Там, дзе дамінуе прамысловасць (напрыклад, у Мінскім, Навагрудскім, Рэчыцкім паветах), дзе чалавек адрываецца ад звыклага занятку земляробствам, разбураецца традыцыйная мараль, людзі становяцца больш чуйнымі і патрабавальнымі да матэрыяльных даброт, менш маральна цнатлівымі ў хрысціянскім разуменні.

Шпілеўскі рашуча адмовіўся ад трактоўкі Беларусі як сялянскага краю. У аўтара "Падарожжа па Палессі і Беларускім краі" Беларусь шматфарбная ў сацыяльным і маёмасным планах, гэта край не толькі вёсак, але і гарадоў з багатай і павучальнай гісторыяй, а беларускі народ – гэта не толькі сялянства, але і прадстаўнікі іншых сацыяльных пластоў, у тым ліку і магнацкіх родаў.

П. Шпілеўскі лічыў беларусаў адным з самых старадаўніх славянскіх "плямён", "самым старадаўнім" і "чыстым" з "рускага племені". Радавод бела-

Репозиторий ВГУ

русаў ён выводзіў ад крывічоў. Праз лаканічны экскурс у мінулае славянства Шпілеўскі адзначыў, што крывічы былі самым шматлікім і моцным славянскім племенем, разам з ільменскімі славянамі яны запрасілі на славянскія землі правадыра (Рурыка – В.Б.), першымі выказалі думку пра неабходнасць існавання адзінай дзяржавы і пра саюз усіх славянскіх плямён. Крывічы "вялі жыццё мірнае, дамаседнае і таму ва ўсёй чысціні і цэласнасці захавалі свой першапачатковы славянскі быт, сваю веру і нарэшце сваю кроўную мову" [1, с. 99]. Беларусы ў паказе Шпілеўскага – язычнікі ў далёкім мінулым. Да язычніцтва пісьменнік ставіўся як да заканамернай фазы ў этнакультурным развіцці сваіх землякоў. На думку П. Шпілеўскага, сапраўдная вера беларусаў – хрысціянства ў яго праваслаўным варыянце. Да каталіцызму пісьменнік ставіўся дастаткова дыпламатычна, пратэстантызм не прымаў і асуджаў тых магнатаў, што сталі фундатарамі пратэстантызму на беларускіх землях.

Народазнаўчы матэрыял у "Падарожжы па Палессі і Беларускім краі" Шпілеўскага выступае ў адзінстве эстэтычнага, камунікатыўнага і пазнавальнага бакоў. Пісьменнік падкрэсліваў самабытнасць і шматфарбнасць праяў культуры беларусаў, праз дэталізаваныя экскурсы ў мінулае і побытавыя малюнкі сцвярджаў моцную "ўкаранёнасць" беларусаў у сусветнай гісторыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Шпилевский, П.М. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю / П.М. Шпилевский. – Минск: Полымя, 1992. – 251 с.

МЕТАФОРИЧЕСКОЕ ПРЕДСТАВЛЕНИЕ КОНЦЕПТА «ЕДА» КАК СПОСОБ РЕАЛИЗАЦИИ МИРОВОЗЗРЕНЧЕСКОЙ КОНЦЕПЦИИ ПИСАТЕЛЯ

О.В. Бельская
Витебск, ВГУ

В лингвистических и литературных исследованиях часто отмечается значимость универсальных общечеловеческих факторов для формирования понятийных систем: единство материального мира, фундаментальных условий жизни, общее магистральное направление деятельности людей, общность механизмов восприятия человеком окружающей действительности.

Национально-культурная коннотация является важным аспектом при анализе концепта. Ее содержание представляет собой соотнесение языковых значений с тем или иным культурным кодом, которым владеют представители определенной лингвокультурной общности. Владение культурным кодом – ключ к адекватной интерпретации культурно значимой информации, заключенной в концепте.

Процесс приема пищи является одной из основных форм бытовой жизни человека, которая всегда получала свою реализацию в художественных текстах. В культурной коммуникации традиция, будучи общей для автора и читателя, создает возможность понимания смысла произведения литературы читателем, и она же обеспечивает последнего набором кодов-критериев, которыми он может воспользоваться, чтобы из множества текстов выделить корпус произведений художественной литературы. В качестве такого кода и может быть назван концепт.

В художественном тексте происходит переосмысление признаков объекта. Как вторичная моделирующая система, он создает эстетический образ обычного

Репозиторий ВГУ